# Гістарычная памяць як дамінанта беларускай ментальнасці: аб'ектывацыя ў мове і тэксце

УДК 811.161.3'373



**Кацярына ПІВАВАР,**
**кандыдат філалагічных навук, дацэнт**

Кацярына ПІВАВАР. Гістарычная памяць як дамінанта беларускай ментальнасці: аб'ектывацыя ў мове і тэксце. Артыкул прысвечаны лінгвакультуралагічнаму апісанню гістарычнай памяці як дамінанты беларускай ментальнасці. На аснове аналізу мастацкіх і публіцыстычных тэкстаў, фальклорных і літаратурных афарызмаў выяўлена, што гістарычная памяць метафарычна аб'ектывуецца праз лексемы спадчына, мінуўшчына, грунт, карані, след у гісторыі. Аўтар прыходзіць да высновы, што гістарычная памяць з'яўляецца важным для беларусаў феноменам, які знайшоў сваю шырокую аб'ектывацыю ў нацыянальнай мове. У беларускамоўных тэкстах падкрэсліваецца важнасць захавання гістарычнай праўды, абарона яе ад хлусні, вялікая роля гістарычнай памяці ў кансалідацыі народа.

Ключавыя словы: каштоўнасная дамінанта, гістарычная памяць, беларуская мова, беларуская ментальнасць, мастацкі тэкст, фальклорны і літаратурны афарызм, лінгвакультуралогія.

Katsiaryna PIVAVAR. Historical memory as the dominant of the Belarusian mentality: objectification in language and text. The article studies linguistic and cultural description of historical memory which is viewed as the dominant of the Belarusian mentality. After analyzing artistic and journalistic texts, folklore and literary aphorisms, the author concluded that historical memory is metaphorically objectified through the lexical units of heritage, past, soil, roots, trace in history. The author believes that historical memory is an important phenomenon for Belarusians, and it was broadly objectified in the national language. Belarusian-language texts emphasize the importance of preserving historical truth, protecting it from lies, and the great role of historical memory in consolidating people.

Keywords: value dominant, historical memory, Belarusian language, Belarusian mentality, artistic text, folklore and literary aphorism, linguistic culturology.

На сучасным этапе развіцця лінгвістыкі нельга не звярнуць увагу на той факт, што навука пра мову зазнае істотныя змены – адбываецца пераход на новую парадыгму – антрапацэнтрычную. Доўгі час мовазнаўства было сфакусіравана на даследаванні мовы як ізаляванай ад знешняга свету сістэмы. У межах новай парадыгмы пры даследаванні мовы галоўную ролю адыгрывае чалавек, яго свядомасць і культура. Кожны чалавек з'яўляецца носьбітам пэўнай культуры і мовы, якія аказваюць непасрэдны ўплыў на фарміраванне яго светапогляду, характару, паводзін – і ўсё гэта атрымлівае моўную інтэрпрэтацыю. Зварот лінгвістаў да інтэгратыўнага вывучэння мовы і культуры дазваляе наблізіцца да сутнасці тых ці іншых моўных з'яў як рэпрэзентантаў культурных сэнсаў, каштоўнасцей, гістарычных звестак. Антрапацэнтрычны погляд на мову прывёў да пашырэння галіны лінгвістычных даследаванняў. Дзякуючы ідэям антрапацэнтрычнасці, абсяг мовазнаўчых прац значна пашырыўся. Узніклі новыя кірункі лінгвістыкі – лінгвакультуралогія, этналінгвістыка, кагнітыўная лінгвістыка, псіхалінгвістыка, лінгваканцэпталогія, гендарная

## ПРА АЎТАРА

ПІВАВАР Кацярына Сяргееўна.

Нарадзілася ў г. Віцебску. Скончыла Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава (2006), аспірантуру гэтай ВНУ (2018). Дактарант кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.

З 2021 года – дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава.

Кандыдат філалагічных навук (2018), дацэнт (2020).

Аўтар больш за 60 навуковых прац.

Сфера навуковых інтарэсаў: беларуская мова ў святле антрапацэнтрычна арыентаванай лінгвістыкі (лінгвакультуралогія, кагнітыўная лінгвістыка), выкладанне беларускай мовы.

лінгвістыка і інш. У.І. Карасік адзначае, што «ўласна лінгвістычнае даследаванне культурных дамінант ажыццяўляецца ў выглядзеназірання і эксперымента (суцэльная выбарка лексічных і фразеалагічных адзінак, а таксама прэцэдэнтных тэкстаў са слоўнікаў, зборнікаў прыказак і афарызмаў, тэкстаў мастацкай літаратуры, газет і г. д., з аднаго боку, і інтэрв'ю носьбітаў мовы, распрацоўка анкет, якія ўключаюць розныя ацэначныя суджэнні, звязаныя з пэўнымі прадметнымі галінамі, з іншага боку)» *[1, с. 169]*.

Мэта гэтага артыкула – выявіць у беларускай мове і тэксце аб'ектывацыю гістарычнай памяці як дамінантнага канцэпту беларускай ментальнасці. Мэта прадугледжвае вырашэнне наступных задач: выявіць беларускамоўныя кантэксты з розных тыпаў дыскурсу (мастацкі, публіцыстычны), а таксама са слоўнікаў прыказак і прымавак, літаратурных афарызмаў; на аснове аналізу шматлікіх беларускамоўных кантэкстаў выявіць моўную рэалізацыю канцэпту 'гістарычная памяць', яго аксіялагічную значнасць і вылучыць паняццевыя кампаненты. Аб'екты даследавання: літаратурныя і фальклорныя афарызмы *[2; 3]*, мастацкі, навукова-папулярны дыскурс. Метады даследавання: кантэкстуальны аналіз, апісальны, семантыка-кагнітыўны. У рэчышчы названых напрамкаў лінгвістыкі мы ўяўляем гістарычную памяць як канцэпт, лінгваментальнае ўтварэнне, якое ўтрымлівае вобразны, каштоўнасны і паняццевыя кампаненты. Гіпотэза нашага даследавання: гістарычная памяць з'яўляецца дамінантным канцэптам у моўнай карціне свету беларусаў.

Мова фарміруецца разам з народам, валодае кумулятыўнай функцыяй (захоўвае ўнікальны гістарычны вопыт народа – напрыклад, у безэквівалентнай лексіцы, устарэлай лексіцы, неалагізмах). Сведчаннем захавання гістарычных падзей у мове з'яўляецца, напрыклад, наяўнасць наступных семантычных груп у парэміялагічным фондзе беларускай мовы: «У.І. Ленін. Камуністычная партыя. Савецкая Радзіма», «Кастрычніцкая рэвалюцыя і Грамадзянская вайна», «Сацыялістычнае будаўніцтва», «Абарона Радзімы», «Культура і новы быт», «Вялікая Айчынная вайна», «Будаўніцтва камунізму і барацьба за мір» *[4]*.

Найбагацейшую інфармацыю пра асаблівасці культуры, ментальнасці, светапогляду народа дае мастацкая літаратура. У ранейшых даследаваннях мы адзначылі рэтраспектыўнасць беларускай літаратуры, яе скіраванасць на гісторыю, даўніну: «у мастацкай літаратуры назіраецца пэўная накіраванасць ментальнасці беларусаў да мінулага, былых нормаў жыцця, а сённяшні і будучы час паўстаюць неакрэсленымі, цьмянымі. Так, тыповымі сведчаннямі своеасаблівага кансерватызму беларусаў з'яўляецца фраза „Гэтак жылі прадзеды і дзяды". Вартым увагі падаецца назіранне, што фантастычныя творы, прысвечаныя будучыні, не распаўсюджаныя ў беларускай літаратуры, у той час як створаны шматлікія вядомыя творы на гістарычную тэматыку (У. Караткевіч, У. Арлоў, Л. Дайнека і інш.)» *[5, с. 37]*.

Намі прааналізаваны афарызмы беларускіх пісьменнікаў з мэтай выяўлення паняццевых кампанентаў канцэпту «гістарычная памяць». Так, найчасцей сцвярджаецца 'важнасць захавання гістарычнай памяці для кансалідацыі і захавання народа', што яскрава пацвярджаецца наступнымі кантэкстамі: *Народ – не зборышча, не гурт… / Калі ён сам сябе ўсвядоміў, / Сваю гісторыю, свой лёс, / Свае правы ва ўласным доме, – / Тады – народ, тады – ён ёсць* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці) *[2, с. 26]*; *Нацыя, / Якая пакорна маўчыць, / Якая забыла пра годнасць, / Якая не ўмее / Нічым даражыць: / Ні краем, / Ні словам родным, / Якая памерці згодна, – / Ці мае права / Нацыяй быць?!* (М. Башлыкоў. Адзінокай свечкай стыне) *[2, с. 58–59]*.

Падкрэсліваецца гераічнасць беларускага мінулага: *Звацца герояў нашчадкам проста, / Але не так проста быць роўнымі ім!* (К. Кірэенка. Помнік герою рэвалюцыі) *[2, с. 57]*; *Вазьмі у звычай, сын герояў і багоў, / Не пагарджаць святым сваім мінулым, / А заслужыць яшчэ, і вартым быць яго* (У. Караткевіч. Беларускае мінулае) *[2, с. 150]*. У сувязі з гэтым варта зазначыць, што ў захаванні гістарычнай памяці важным з'яўляецца захаванне памяці найперш пра славутых беларусаў: *Пра сталасць і вартасць народа, нацыі сведчыць не тое, якіх талентаў, якіх геніяў нарадзіў народ, а тое, як ставіцца народ, нацыя да народжаных сваіх талентаў, геніяў, як народ, нацыя з імі абышлася і абыходзіцца* (Ф. Янкоўскі. Само слова гаворыць) *[2, с. 73]*. Прасочваецца выразная сувязь паміж паняццямі «гістарычная памяць» і «мова»: *Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў сваю мову – ўсё згубіў* (У. Караткевіч. Беларускае мінулае) *[2, с. 150]*.

Гістарычная памяць увасабляецца ў беларускай свядомасці ў своеасаблівым ландшафце – курганах (валатоўках) – дзе, паводле народных легендаў, пахаваны беларускія асілкі-волаты, а таксама вобразы роднай зямлі, грунту: *Вучы дзяцей яшчэ з пялёнак: / Каб не скаціцца пад адхон – / Хай з курганоў тваіх зялёных / Бяруць у заўтрае разгон* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці) *[2, с. 138]*; *Каб быць смелым, то для гэтага трэба быць дужым, а каб быць дужым, то трэба мець цвёрды грунт пад нагамі і ясна пачуваць і ведаць, дзеля чаго ты жывеш на свеце* (Я. Колас. Асінае гняздо) *[2, с. 155]*.

Важна адзначыць метафарычнае апісанне вобраза памяці. Яна паўстае як істота, якая валодае органамі ўспрыняцця: вачыма, вушамі і нават пальцамі: *Ды памяць, як лішні вагон, / не адчэпіш. / І без яе наперад не рушыш. / У памяці – вочы, / якіх не аслепіш. / У памяці – вушы, / якіх не аглушыш* (П. Макаль. Кажуць, даволі пра дальнія страхі…) *[2, с. 149]*; *Добра бывае апынуцца ў прыемным ад перажытасці хваляванні. Успомніць забытае, але знаёмае, чапаць яго пальцамі памяці* (Я. Скрыган. Смага) *[2, с. 149]*, называецца сяброўкай: *Будзь да канца са мной, сяброўка-памяць, / Нібы крышталь гранёны, чыстай будзь* (А. Звонак. Памяць) *[2, с. 148]*.

Гістарычная памяць атрымала ў мастацкім тэксце мноства моўных рэпрэзентацый, самая частотная з якіх – спадчына: *Спадчынай валодае той, хто мае моц засвоіць яе, той жа, хто гэтай моцы не мае, у лепшым выпадку з'яўляецца яе захавальнікам* (А. Разанаў. Зномы) *[2, с. 152]*; *Спадчына не ў мінулым, а з мінулага: яна – вектар, які паказвае дарогу, яна – аблічча ўчалавечанага часу* (А. Разанаў. Зномы) *[2, с. 152]*; *У нас добрая спадчына, паболей бы добрых спадчыннікаў* (М. Стральцоў. Спадчыннасць) *[2, с. 153]*; *Пакіньма спадчыну мы для патомкаў / Інакшую ад той, / Што узялі ад продкаў на абломках / Гісторыі сваёй* (Я. Купала. Безназоўнае) *[2, с. 151]*. Самым вядомым рэпрэзентантам з'яўляецца верш Янкі Купалы, які стаў вядомай песняй у выкананні ансамбля «Песняры»: *Ад прадзедаў спакон вякоў / Мне засталася спадчына; / Паміж сваіх і чужакоў / Яна мне ласкай матчынай [6]*.

Пры стварэнні вобразу памяці пра падзеі жыцця чалавека нярэдка выкарыстоўваецца вобраз каранёў (радзей – дрэва): *Толькі на ўласных каранях дае дрэва багаты плод* (Я. Колас); *Дзе карані – жыццё красуе!* (У. Карызна. Трыялет) *[2, с. 240]*; *Без каранёў вялікіх не бываць / Вялікім дубу, хоць з пароды й гэтай* (Н. Мацяш. Алёша з Доўбні) *[2, с. 239]*; *На дрэве памяці з кожным годам багацейшы ўраджай* (М. Танк. На дрэве памяці…) *[2, с. 150]*.

У творах беларускай мастацкай літаратуры гучыць заклік пакінуць добры след у гісторыі: *Не важна, хто ты – хлебароб, паэт, / Адно на ўсіх людзей зямное шчасце. / Галоўнае, які пакінеш след, – / Па ім ступаць далей твайму нашчадку* (С. Законнікаў. Устань да сонца!) *[2, с. 146]*; *Чалавека сляды у стагоддзях не гінуць. / Гэта помні заўжды, / Перш чым след свой пакінуць* (Е. Лось. Чалавека сляды ў стагоддзях не гінуць) *[2, с. 147]*; *Усё знікае, праходзіць, як дым, / Светлы ж след будзе вечна жывым* (М. Багдановіч. Думы) *[2, с. 147]*.

**5 красавіка споўнілася 50 гадоў з дня заснавання філіяла Літаратурнага музея Янкі Купалы – мемарыяльнага запаведніка «Вязынка», створанага на месцы былой сядзібы, дзе 7 ліпеня 1882 года нарадзіўся будучы паэт**



Мастакі слова сцвярджаюць, што гістарычную памяць трэба захоўваць – як пра добрае, так і кепскае: *А чалавечая памяць багатая. Ёй трэба насіць усё тое, чаму не трэба – чаму нельга – зноў паўтарыцца* (Я. Скрыган. Смага); *Амністыі не знае памяць, / яна падзей мінулых склад* (А. Астрэйка. Няма амністыі пачуццям); *Крый Бог нам абяспамяцець ізноў* (Н. Мацяш. Пяць галасоў). Важнасць праўдзівасці памяці хвалюе, прымушае весці барацьбу з ілжывымі сведчаннямі, супрацьстаяць хлусні: *Праўда ў гісторыі – функцыя адназначная, з яе робяць урокі. З хлусні ніякіх урокаў не зробіш, апроч новай хлусні* (В. Быкаў).

Падкрэсліваецца бязмежнасць памяці – як у часе, так і прасторы: *Не мае Памяць межаў у граніц, / Яна пульсуе ў кожным радаводзе* (З. Марозаў. Памяць); *Раны зажываюць – віры памяці ніколі не супакояцца* (А. Вялюгін. Пад ветразем у полі); *Галінка памяці / Не можа не стаць / Галінкай вечнасці!* (А. Лойка. Балада бэзавай галінкі) *[2, с. 149 ]*.

Безумоўна, няведанне свайго мінулага, бяспамяцтва прыводзіць да памылак у будучыні: *Хто не памятае мінулага, хто забывае мінулае – асуджаны зноў перажыць яго. Безліч разоў* (У. Караткевіч); *Капацца ў мінулым – варушыць, набліжаць будучае* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання) *[2, с. 149]*; *Людзі / глядзяць у будучыню, / мінулае – / на людзей* (А. Разанаў. Пункціры); *Будучыня, моцны твой падмурак! / Для усіх – зямлян і землякоў – / вырасталі помнікі культуры, / памяць нерастрачаных вякоў. / Бо цаглінка кожная у замку –/ нашых продкаў скамянелы крык* (С. Панізьнік. Спадчыннікі). Такім чынам, памяць пра мінулае з'яўляецца фактарам фарміравання шчаслівай будучыні.

Калі мастацкая літаратура адлюстроўвае глыбінныя веды пра светапогляд і каштоўнасныя ўстаноўкі, то публіцыстыка сведчыць пра сучасныя працэсы, развіццё грамадства, хуткія змены падзей. Так, разважаючы над выхаваўчымі магчымасцямі журналістыкі, Т.У. Падаляк заўважае: «Журналістыка, будучы крыніцай і рэтранслятарам каштоўнасцей соцыуму ва ўсёй іх прадметна-каштоўнаснай разнастайнасці, з'яўляецца аксіялагічным канструктам у культуры грамадства. Яна не толькі фарміруе пэўны каркас эталонаў, ідэалаў, маральна-этычных уяўленняў, але адначасова можа выступаць і практычнай сілай, здольнай, як сведчыць гісторыя, кансалідаваць нацыю або, наадварот, дэстабілізоўваць яе» *[7, с. 234]*. Як справядліва адзначае даследчыца, «без праўдзівай трансляцыі гістарычнага вопыту народ губляе аксіялагічныя арыенціры, страчвае сацыяльную памяць, якая з'яўляецца фундаментам маральнасці грамадства» *[7, с. 135]*.

Намі прааналізаваны беларускамоўныя інфармацыйныя рэсурсы (zwiazda.by, sb.by) з мэтай вызначэння семантычнага напаўнення словазлучэння «гістарычная памяць» метадам кантэкстуальнага аналізу. Неабходна заўважыць, што ў 2022 годзе, абвешчаным Годам гістарычнай памяці, безумоўна, гэтая тэма актуалізуецца. Найчасцей асвятляюцца мерапрыемствы, накіраваныя на захаванне памяці пра Вялікую Айчынную вайну, генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Аналіз медыядыскурсу і публіцыстычных тэкстаў па запыце «гістарычная памяць» дазваляе выявіць самы частотны паняццевы кампанент – 'гістарычная памяць – фактар кансалідацыі грамадства'.

Заслугоўвае ўвагі аўтарскі праект Вітаўта Чаропкі пад назвай «Пантэон Айчыны» на партале газеты «Звязда», які змяшчае займальныя тэксты пра славутых землякоў – вучоных (Е. Раманаў, І. Насовіч, М. Нікіфароўскі, К. Каганец і інш.). Веданне біяграфій славутых землякоў, безумоўна, фарміруе трывалае пачуццё любові да Радзімы, павагі да яе гісторыі.

Перадача гістарычнай памяці моладзі – важная задача грамадства, якая вырашаецца ў тым ліку і дзякуючы выданню шматлікіх навукова-папулярных кніг, у якіх адлюстраваны важныя вехі беларускай гісторыі. Кнігі аб'яднаны ў серыях «Беларусь. Трагедыя і праўда памяці», «Беларусь помнит: во имя жизни и мира» і г. д. Навуковая, навукова-папулярная літаратура *[8; 9]*, серыі кніг для дзяцей «Адкуль наш род», «Як жылі нашы продкі» і г. д.

Важнасць гістарычнай памяці ў карціне свету беларусаў бачыцца нам у захаванні нашым народам такіх этнаспецыфічных памінальных дзён, як Дзяды і Радаўніца (паводле падлікаў этнографаў, у беларускім народным календары існуе мінімум 15 памінальных дзён). У гэтыя дні прынята прыбіраць магілкі памерлых родзічаў, праводзіць памінальныя вячэры. Радаўніца (Раданіца, Радуніца, Радаўніцкія Дзяды, «Вялікдзень мёртвых», праводная ці мёртвая радаўніца, дзень яднання, успамінаў, светлы дзень) – дзень памінання памерлых ва ўсходніх славян. Бярэ вытокі з язычніцтва, звязаны з культам продкаў. Толькі ў Беларусі ён з'яўляецца дзяржаўным выхадным днём. Хрысціянская царква прымеркавала свята да Вялікадня (адзначаецца на 9-ы дзень пасля яго, у аўторак). Паводле адной з версій, у аснове назвы Радаўніца ляжыць слова «радасць», а некаторыя лічаць, што паняцце пайшло ад слова «род». У беларусаў даўні звычай памінання продкаў атрымаў надзвычайную трываласць, асаблівае развіццё, шматстайнасць, рэгіянальныя асаблівасці. Дзяды – адна з рытуальных формаў народнай культуры беларусаў, старажытны абрад памінання нябожчыкаў, а таксама дзень, калі адбываўся гэты абрад. Адзначаюцца *каляндныя дзяды* 'гадавы

памінальны дзень перад Раством', *масленыя дзяды* 'гадавы памінальны дзень перад Масленіцай', *пілінаўскія дзяды* 'гадавы памінальны дзень перад калядным постам', *радонічныя дзяды* 'гадавы памінальны дзень перад Радуніцай', *траецкія дзяды* 'гадавы памінальны дзень перад Троіцай'. Спецыфіка абраду выяўляецца ў семантыцы беларускага фразеалагізма *(нагатаваць) ежы як на дзяды* 'шмат ежы', бо па традыцыі на Дзяды накрывалі багаты памінальны стол (нават нягледзячы на цяжкае матэрыяльнае становішча). У гэтым бачыцца моцны культ продкаў у нацыянальнай свядомасці беларусаў, прычым вучоныя (этнографы, гісторыкі) сцвярджаюць, што ў нас ён існуе яшчэ з дахрысціянскіх часоў. Культ продкаў разумеецца намі, як пакланенне душам памерлых родзічаў, асобныя вераванні ў іх боскасць і абрады іх ушанавання. Продкі ўяўляюцца як «*сапраўдныя гаспадары роднай зямелькі*». З пашырэннем хрысціянства культ продкаў захоўваўся ў народных вераваннях. Пры святкаванні калядных святаў, вяселляў, хрэсьбінаў было прынята спачатку пакінуць рытуальную ежу продкам і толькі потым самім прыступіць да святочнай вячэры.

Такім чынам, на аснове кантэкстаў з мастацкай літаратуры і сучасных беларускамоўных медыя, аналізу культурнай спадчыны (у прыватнасці, народных свят) зроблены вывады пра высокую аксіялагічную значнасць гістарычнай памяці, выяўлены моўная рэпрэзентацыя канцэпту 'гістарычная памяць': *спадчына, грунт, сувязь з мовай, продкі, карані, героі/таленты, след,* метафарычныя сродкі – *сяброўка-памяць, нібы крышталь гранёны; магілы дзядоў*. Вылучаны наступныя паняццевыя кампаненты: 'гістарычная памяць – фактар кансалідацыі грамадства', 'неабходнасць захоўвання гістарычнай памяці', 'сувязь гістарычнай памяці з мовай', 'бяспамяцтва прыводзіць да памылак у будучыні'.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 01.03.2022 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Карасик, В.И. Языковая кристаллизация смысла: монография / В.И. Карасик. – Волгоград: Парадигма, 2010. – 422 с.
2. Гаўрош, Н.В. Афарыстычныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў / Н.В. Гаўрош, Н.М. Нямковіч. – Мінск: Вышэйшая школа, 2012. – 638 с.
3. Гаўрош, Н. Падборка афарызмаў «Амністыі не знае памяць…» Памяць чалавека, памяць пакаленняў; мінулае; спадчыннасць і спадчына / Н. Гаўрош, Н. Нямковіч // Роднае слова. – 2010. – № 8. – С. 58–89.
4. Прыказкі і прымаўкі: у 2 кн. / АН БССР; А.С. Фядосік (рэд.). – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 1. – 556 с.
5. Півавар, К.С. Беларуская ментальнасць у моўнай прасторы мастацкага тэксту: манаграфія / К.С. Півавар. – Віцебск: ВДУ імя П.М. Машэрава, 2015. – 155 с.
6. Купала, Я. Спадчына / Я. Купала // Збор твораў: у 6 т. – Мінск, 1953. –Т. 4. – С. 11.
7. Падаляк, Т.У. Аксіялогія сучаснай беларускай журналістыкі / Т.У. Падаляк; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т, 2016. – 263 с.
8. Маляўка, М. Спадчына, або Каб не стаць манкуртам / М. Маляўка. – Мінск: Народная асвета, 2020. – 159 с.
9. Тарасаў, К. Беларусь: гістарычнае падарожжа для дзяцей / К. Тарасаў. – Мінск: Лекцыя; Бацькаўшчына, 2000. – 112 с.